**Т.М.Гулева,** *ст.выкладчык*

# СУВЯЗЬ ВУЧЭБНАЙ І ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ Ў АКАДЭМІЧНАЙ ГРУПЕ СТУДЭНТАЎ

Як вядома, працэсы навучання і выхавання студэнцкай моладзі ўзаемазвязаныя. Заняткі па вывучэнні роднай беларускай мовы ў сувязі з гэтым набываюць асаблівае значэнне ў патрыятычным выхаванні студэнтаў.

Адным з найважнейшых паняццяў дзяржаўнай ідэалогіі з'яўляецца паняцце нацыянальнай ідэі. У нацыянальнай беларускай ідэі ўвасабляецца імкненне беларускага народа да самастойнасці, незалежнасці, захавання і развіцця самабытнай беларускай культуры, навукі і, безумоўна, мовы.

Сёння развіццё беларускай культуры, гісторыі, вывучэнне мовы, нацыянальных традыцый павінны стаць прыярытэтнымі для беларусаў. Вядомы лінгвіст І.Сразнеўскі пісаў: "Народ выяўляе сябе найпаўней і найдакладней у мове сваёй. Народ і мову нельга ўявіць адно без аднаго". Мова адлюстроўвае менталітэт народа, асаблівасці яго мыслення і псіхікі, эстэтычныя і этычныя нормы. Менавіта ў слове беларускі народ замацаваў свой светапогляд, свой жыццёвы вопыт.

Выкладчык роднай мовы павінен данесці да кожнага студэнта, што моўная культура нашага народа надзвычай багатая і самабытная, што фальклор беларусаў – адзін з найбагацейшых ў свеце, што беларускімі майстрамі слова створана глыбокая і разнастайная па жанрах мастацкая літаратура, у якой прадстаўлены самабытны светапогляд беларусаў, непаўторнае бачанне жыцця. Бясспрэчна, што такія моўныя скарбы сведчаць пра высокі інтэлект народа, дапамагаюць зразумець яго філасофію. Мова звязвае наша мінулае і будучае, яднае продкаў і нашчадкаў. Студэнты павінны зразумець, што мова – найважнейшая прымета нацыі, падмурак самасвядомасці народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На лекцыйных і практычных занятках выкладчык паказвае значэнне роднай мовы ў жыцці грамадства ў цэлым і кожнага чалавека паасобку, у развіцці духоўнай культуры нацыі і культуры асобы. На лепшых прыкладах беларускай мастацкай прозы і паэзіі можна прадэманстраваць мілагучнасць беларускай мовы, багацце яе слоўніка і вобразных сродкаў. Паступова студэнты пранікаюцца любоўю да роднай мовы, стануць адчуваць патрэбу размаўляць па-беларуску не толькі ў час аўдыторных заняткаў, а і дома, у сям'і, з сябрамі.

Важную выхаваўчую ролю мае правільны падбор дыдактычнага матэрыялу для арфаэпічнага, арфаграфічнага, лексікалагічнага і граматычнага аналізаў, а таксама тэкстаў для руска-беларускіх перакладаў. Гэта, перш за ўсё, тэксты пра беларускую культуру, гісторыю, мастацтва, славутых беларусаў; гэта урыўкі з навуковых прац вядомых беларускіх вучоных гуманітарнага профілю. У працэсе працы з такімі матэрыяламі студэнты далучаюцца да духоўнай, інтэлектуальнай культуры народа, яго гісторыі, традыцый і здабыткаў. Дзякуючы гэтаму, у студэнтаў выхоўваюцца нацыянальная самасвядомасць, сацыяльны аптымізм і жаданне працаваць на карысць сваёй дзяржавы.

Калі на практычных занятках па беларускай мове студэнт робіць вусныя і пісьмовыя паведамленні і даклады пра падзеі грамадскага і культурнага жыцця сваёй краіны, пра выдатных дзеячаў культуры і мастацтва, калі дыдактычныя матэрыялы пры вывучэнні розных раздзелаў мовазнаўства пашыраюць веды студэнтаў пра традыцыі, гісторыю, знакамітых людзей Бацькаўшчыны, тады навучанне і выхаванне, вучэбная і ідэалагічная работа суіснуюць натуральна, у цесным адзінстве.

Такія заняткі і выкарыстаныя на іх матэрыялы дадуць студэнтам штуршок да больш падрабязнага вывучэння культуры і гісторыі сваёй дзяржавы, запаляць у іх душах пачуццё гордасці за свой народ і яго слынных людзей.

Вельмі важна стымуляваць моладзь нестандартна мысліць, выказваць арыгінальныя меркаванні, творча вырашаць любыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пастаўленыя задачы, абгрунтоўваць сваю ўласную пазіцыю. Гэтага дапамагаюць дасягнуць заняткі па роднай мове, калі яны праходзяць у творчай атмасферы супрацоўніцтва выкладчыка і студэнтаў.

Такім чынам, найважнейшымі задачамі выкладання беларускай мовы ў ВНУ з'яўляюцца далучэнне студэнцкай моладзі да духоўнай, культурнай, мастацкай спадчыны беларускага народа, выхаванне нацыянальна свядомага грамадзяніна, сапраўднага патрыёта сваёй Радзімы. А з ростам нацыянальнай самасвядомасці непазбежна павялічыцца колькасць прыхільнікаў і актыўных носьбітаў беларускай мовы.

---

1. *Мельник В.А.* Государственная идеология Республики Беларусь: концептуальные основы. – Мн.: Тесей, 2003.

2. *Основы* идеологии белорусского государства: учеб. пособие для вузов / под общ. ред. С.Н.Князева, С.В.Решетникова. – Мн.: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2004.

3. *Яскевич Я.С.* Основы идеологии белорусского государства: мировоззренческие ценности и стратегические приоритеты. – Мн.: РИВШ БГУ, 2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ